# ПРАТАКОЛ ДА ПАГАДНЕННЯ ПАМІЖ УРАДАМ КІТАЙСКАЙ НАРОДНАЙ РЭСПУБЛІКІ І УРАДАМ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ АБ УЗАЕМНЫХ БЯЗВІЗАВЫХ ГРУПАВЫХ ТУРЫСЦКІХ ПАЕЗДКАХ АД 11 СТУДЗЕНЯ 1993 ГОДА

Урад Кітайскай Народнай Рэспублікі і Урад Рэспублікі Беларусь (далей – Дагаворныя Бакі) на падставе змяненняў сучаснай сітуацыі вырашылі унесці змяненні да зместу Пагаднення паміж Урадам Кітайскай Народнай Рэспублікі і Урадам Рэспублікі Беларусь аб узаемных бязвізавых групавых турысцкіх паездках (далей – Пагадненне), і дамовіліся аб ніжэйпададзеным:

## Артыкул 1

Артыкул 1 Пагаднення выкласці ў наступнай рэдакцыі:

"Артыкул 1

Групы турыстаў у складзе пяці і больш чалавек, арганізаваныя турыстычнымі арганізацыямі, прызначанымі кожным з Дагаворных Бакоў, могуць уязджаць на тэрыторыю другога Дагаворнага Боку без віз праз пункты пропуску, адкрытыя для міжнародных зносін, аднога Дагаворнага боку на тэрыторыю іншага Дагаворнага боку. Члены груп павінны мець пры сабе сапраўдныя дакументы для выезду за мяжу. Кіраўнікі груп павінны мець пры сабе запрашальныя лісты ад турыстычных арганізацый, прызначаных другім Дагаворным Бокам, а таксама спісы членаў турысцкіх груп.

Грамадзяне дзяржавы аднаго з Дагаворных Бакоў падчас знаходжання на тэрыторыі дзяржавы другога Дагаворнага Боку павінны выконваць заканадаўства дзяржавы знаходжання, у тым ліку правілы знаходжання замежных грамадзян.

Грамадзяне дзяржавы аднаго Дагаворнага Боку, парушыўшыя на тэрыторыі дзяржавы другога Дагаворнага Боку палажэнні дадзенага Пагаднення або правілы знаходжання, нясуць адказнасць у адпаведнасці з заканадаўствам дзяржавы знаходжання."

## Артыкул 2

Артыкул 2 Пагаднення выкласці ў наступнай рэдакцыі: "Спісы членаў турысцкіх груп павінны змяшчаць указанне імя, прозвішча, пола, прафесіі, месца і даты нараджэння, нумара сапраўднага дакумента для выезду за мяжу, даты ўезду і выезду, назвы каардынацыйнага органа

іншага Дагаворнага Боку, які прымае групу, і завяраюцца пячаткай каардынацыйнага органа, прызначанага Дагаворным Бокам, які накіроўвае турысцкую групу. Спіс павінен быць прад'яўлены пагранічным кантрольным органам іншага Дагаварнога Боку для праверкі пры ўездзе і выездзе".

Артыкул 3

У Артыкуле 3 Пагаднення сказ "Члены турысцкіх груп павінны дзейнічаць у калектыўным парадку" выкласці ў наступнай рэдакцыі: "Члены турысцкіх груп уязджаюць на тэрыторыю, выязджаюць з тэрыторыі і перамяшчаюцца па тэрыторыі дзяржавы прымаючага Дагаворнага Боку аднachасова і ў складзе групы.".

Артыкул 4

Артыкул 4 Пагаднення выкласці ў наступнай рэдакцыі:

"Артыкул 4

Каардынацыйнымі органамі Дагаворных Бакоў з'яўляюцца:

ад Кітайскага Боку – Дзяржаўнае ўпраўленне па справах турызму Кітайскай Народнай Рэспублікі, а таксама ўпаўнаважаныя кампетэнтныя органы па справах турызму народных урадаў правінцый, аўтаномных раёнаў, гарадоў цэнтральнага падпарадкавання;

ад Беларускага Боку – Міністэрства спорту і турызму Рэспублікі Беларусь, а таксама ўпаўнаважаныя кампетэнтныя органы па справах турызму абласцей і горада Мінска.

Каардынацыйныя органы Дагаворных Бакоў у адпаведнасці з унутраным заканадаўствам зацвярджаюць спісы турыстычных кампаній, ўпаўнаважаных на арганізацыю бязвізавага выезду турысцкіх груп даннага боку і прыём турысцкіх груп па бязвізаваму ўезду іншага Боку.

Дагаворныя Бакі на працягу трыццаці дзён з даты ўступлення ў сілу Пратакола да Пагаднення паміж Урадам Кітайскай Народнай Рэспублікі і Урадам Рэспублікі Беларусь аб узаемных бязвізавых групавых турысцкіх паездках ад 11 студзеня 1993 года па дыпламатычных каналах прадастаўляюць другому Дагаворнаму Боку ў пісьмовай форме на афіцыйнай мове сваёй дзяржавы і на англійскай мове спіс каардынацыйных органаў і ўзоры іх афіцыйных адбіткаў пячатак, а таксама спіс турыстычных арганізацый з указаннем назвы арганізацыі, адраса, нумара тэлефона кантактнай асобы, факса і электроннага адраса.

У выпадку неабходнасці Дагаворныя Бакі могуць па дыпламатычных каналах уносіць змены і дапаўненні ў спісы найменняў каардынацыйных

органаў і турыстычных кампаній".

Артыкул 5

Артыкулы 6 і 7 Пагаднення выключыць.

Артыкул 6

Артыкулы 8 і 9 Пагаднення лічыць адпаведна Артыкуламі 6 і 7 Пагаднення.

Артыкул 7

Дадзены Пратакол ўступае ў сілу па заканчэнні 30 дзён з дня апошняга паведамлення па дыпламатычных каналах у пісьмовай форме аб выкананні Дагаворнымі Бакамі ўнутрыдзяржаўных працэдур.

Дадзены Пратакол спыняе дзеянне адначасова са спыненнем дзеяння Пагаднення.

Здзейснена ў горадзе Куньмін "14" лістапада 2015 года ў двух экзэмплярах, кожны на кітайскай, беларускай і рускай мовах, прычым усе тэксты маюць аднолькавую сілу.

У выпадку ўзнікнення разыходжанняў у тлумачэнні палажэнняў дадзенага Пратакола Дагаворныя Бакі кіруюцца тэкстам на рускай мове.

| За Урад Кітайскай Народнай Рэспублікі | За Урад Рэспублікі Беларусь |
| --- | --- |